Ахрэм Нядбайла
(Уладзімір Папковіч)

# Вы будзеце смяцца...

Віцебск
2008

## СВЕТЛАЯ ЎСМЕШКА — НАШ ПАРОЛЬ

Ахрэм Нядбайла... Два полюсы ў гэтым светлым імені-прозвішчы. Ахрэм! – і чуецца, як рыпіць у руках свежапамыты агурок «хр...эм», хрусткі, сакаўны – так ахвота пакаштаваць яго з цягучым кветкавым мядком, як здавён любілі частаваць ласых унучкаў беларускія дзяды-пчаляры. Імя гэтае набрынялае маладой энергіяй, няўрымслівай сілай. А Нядбайла? Наадварот. Нібы вада перакочваецца цераз круглабокі вялізны валун, што і цурчання не чутно – няма вострых вуглоў. Нібыта і быў намер ударыць малаточкам літары «б», але перакацілася цераз гарушку корць – «ла» – плаўна гопнулася спачыннай лянотай, улеглася мураговай «аддухай», як кажуць у нас на Лепельшчыне стомленыя са світанка касцы...

У Ахрэме Нядбайле – паўната жыцця. Творца напоўніўся ёю з 1991 года. Менавіта ж тады прыдумаў сабе гэты літаратурны псеўданім віцебскі паэт, перакладчык з нямецкай мовы і педагог Уладзімір Папковіч. Той парой ён, чалавек шырокіх здольнасцей, быў журналістам, працаваў у газеце «Народнае слова». Уладзімір Антонавіч «адпачываў» ад студэнтаў у нашай рэдакцыі цэлыя паўтара года, пакуль зноў не вярнуўся на сваю кафедру. За гэты час, можна сказаць, і акрыяў непаўторны талент гарэзлівага Ахрэма. Тады рукой Уладзіміра Папковіча ён пісаў з найвялікшай ахвотай і, як кажуць, «у нумар». Пра пацешнага бюракрата і ягоную жонку, пра гаротнага партакрата і ягоную ідэю, пра людскія жарсці, аблуду ды ўсялякія хоць і шкодныя, але ж пацешныя звычкі. І ўсё гэтаму спрыяла. У разгары ж была перабудова, «бурапенны час», калі зрушваўся з месца, здавалася, каменна прыкуты ідэалагічны мацярык, перацярушваліся ў труху людскія лёсы пад усё тым жа поклічам пра шчаслівейшую долю. Не дай вам Божа жыць у пару перамен, – казалі ў свой час мудрэйшыя з мудрэйшых. Але ж Ахрэм Нядбайла якраз і зажыў той парою. Не зажыўся, з ветрам у кішэнях, але з лёгкай думкай у галаве і з маладым настроем у сэрцы. Іншым разам з хрумсткім агурком ды поўнай чаркай. Мусіць, спрацаваў у арганізме Ахрэмкі прапрапрапрадзедаўскі ген, усплыў паплаўком у душы беларускі досвед, ды напуцілі яго на цвярдзейшую дарожку, у бок ад сацыяльнай каламуці. Усё адно што продкі далі запавет: успрымай чарговы ператрус як чарговую падставу для смеху. Смех кожнага з нас робіць роўным сярод людзей і трошачкі ўзвышае над часам. Ахрэм быў верны сваёй натуры. Дык не штыкаваў пяром у

ідэалагічным счубленні той пары. Так, злёгку папікне каго, пад'ялдыкне, але ж не са злосці, а дзеля навукі: маўляў, помні, галубок, – ніхто не пераможа на гэтым свеце час, усіх ён затуліць адной заслонаю, Бога ніхто за бараду не возьме...

Прыемна, што Ахрэм Нядбайла аказаўся такім рупным і гаспадарлівым на сваёй літаратурнай дзялянцы. І прытым, нягледзячы на немаладыя гады, абрабляе яе і пасёння. Усмешлівы, жартаўлівы, яшчэ здатны – можа, па інерцыі, а можа, і з нязводнага спадчыннага шалу – заляцацца да дзевак. Значыць, вясёлы, натхняльны настрой яшчэ доўга не будзе існці на звад.

Беларусы, якія здаецца спрадвеку заручаны з рознай злыбядой ды калатнечай, не надта схільныя да жарцікаў, можа, нават трохі панылыя ў гэтым, бо занятыя ў сваіх запаветных думах пра новую зямлю ды лепшую долю. Каб пажартаваць, ім патрэбна спецыяльная нагода, нібы для якой надта сур'ёзнай справы. Што зробіш: прыкрасці лёсу, крывуліны гісторыі...

Дык вось, Уладзімір Папковіч праз Ахрэма Нядбайлу, як мне здаецца, парушае гэтую прадвызначанасць. Ён не прымерваецца, як прымерваюцца сякерай, каб расшчапаць цурбак, не шукае нагоду, а жартуе, як дыхае, незаўважна для сябе, але ж так чулліва для іншых. Нібыта мімаходзь, нязмушана, але так трапна. Аказваецца, для гумару неабавязкова мець мэту, як у сатыры, гумар – гэта ўсяго толькі прыкмета і праява жыццялюба, чалавека з добрым, адкрытым для людзей сэрцам.

Колькі разоў я сарамаціў свайго старэйшага сябра Уладзіміра Антонавіча Папковіча: сам выдаеш паэтычныя зборнікі, пераклады раманаў нямецкіх пісьменнікаў, а Нядбайлу, якога спарадзіў, пусціў у літаратурны свет, заціскаеш, не даеш яму прасцягу, месца на кніжнай паліцы. Але ён махаў рукой, не слухаў. Пакуль сам нарэшце не саспеў да выдання твораў занядбанага, але па-ранейшаму жыццястойкага і ўсмешлівага Ахрэма. Сабраў у стос рукапіс і прынёс мне. Маўляў, бярыся за рэдагаванне, як калісьці ў газетныя дзевяностыя. Я пагадзіўся з ахвотай і з ужо, лічы, атрыманым авансам добрага настрою.

Але ў назве зборніка спачатку ўбачыў фанабэрыю, маўляў, слова маё змушальнае, анікуды не дзенецеся – будзеце смяяцца. Я трымаўся, а потым і праўда засмяяўся. Міжволі. І каб сямейнікі не падумалі, што пачынаю вар'яцець, прачытаў і ім адно з двухрадкоўяў. І смех памножыўся. Гумар любіць, калі яго па-сяброўску дзеляць.

«Так было і з Алесем Разанавым, – сказаў Уладзімір Антонавіч пра выбітнага нашага паэта, якому ў свой час дарыў тое-сёе з апублікаваных твораў Ахрэма. – Ён таксама чытаў «пацешкі» сваім родным. З ахвоты...».

Наогул, гумар раўняе ўсіх, бо мерка ў яго ўніверсальная – наяўнасць чалавечнасці ды адмаўленне ад зацятасці ва ўсіх жыццёвых сферах. Гумар – дамоўленасць людзей жыць у добрай згодзе, пацвярджаючы гэтую дамоўленасць светлымі ўсмешкамі.

Дык вы будзеце смяяцца?!

**Сяргей Рублеўскі.**

**Віцебск,**
**10 сакавіка 2008 года.**

## ЗАКЛІК

Паэт!
Не трэба гвалтаваць сябе,
Што вельмі часта
У жыцці здараецца,
Бо ў гэтай самаеднай барацьбе
Талковага нічога не ствараецца.

Паэт!
Сілком нічога не рабі.
Палашчы музу, і яна пагодзіцца.
А лепей ты дзяўчыну палюбі.
Калі не верш,
Дык хоць дзіця народзіцца.

## ПАЭТ

Язэп, мой сябар і сусед, –
Паэт.
На выгляд хлопец зграбны, ладны
І піша складна.

Зайшоў к яму пасля вячэры –
Сядзіць збялелы, як папера,
Глядзіць на чысты белы ліст
І голаў апусціў уніз.

Прашу: «Скажы мне, што на сэрцы?
Мо' памагу табе ў бядзе.
Ці, можа, нітка думкі рвецца,
Ці рыфма-котка не ідзе?».

«Ды не, браток, не ў рыфме справа –
Руку на вершах я набіў.
Начальнік мне вярнуў заяву,
Памылак, кажа, нарабіў».

## ВУЧОНЫ

Ад нараджэння надта кволым
Рос Целяпуньчыкаў Яўсей.
Быў ён і ў гульнях невясёлы,
Баяўся пеўня і гусей.

Выдатных здольнасцяў не меў,
Ды схітраваць заўсёды ўмеў.
Настаўніку пачне здалёку:
«Да рэвалюцыі яшчэ...».
І гэтак шчыра з паўурока
Ваду ў ступе пратаўчэ.
Яўсея бацька хваліць людзям:
«Дальбог, вучоным малец будзе».

Сын спраўдзіў спадзяванні таты,
І родныя цяпер усе
Ім ганарацца –
Кандыдатам
Стаў наш уседлівы Яўсей.
І працу выдаў: «Птушка бусел
І роля сэксу ў Беларусі».

*   *   *

Дзівакі складаюць вершы,
Крэмзаюць апавяданні.
Сумна, пані.
Кветка вяне.
Бессэнсоўна сучка брэша.
У душы ад ранку пуста,
Як у выпітай бутэльцы.
Вунь павук паўзе па бэльцы.
Во каму жывецца тлуста.
Пэўна ж, падла, мае мэту:
Недзе муха дрэмле млява,
Дрэнь у соннай мухі справы,
Гад сажрэ, відаць, кабету.

*    *    *

Не багаты аніякімі здабыткамі,
Ні маральнымі, ні матэр’яльнымі,
Акрамя скамечанага сшытка
З вершамі, вядома ж, геніяльнымі.

*    *    *

Калі жыццё занадта ціснe,
Палёгкі, браце, не шукай...
Чакай: як рак на горцы свісне,
Дык абжывай чаканы рай.
Цярпі пакуль што і трывай,
Злосць назаўсёды пахавай.

*    *    *

Ах, не магу я, хоць трэсні,
Рашыць вось такую загадку:
Чаму ўсюды чуюцца песні,
А хатачка ў нас
Не ў парадку?

*    *    *

Па вуліцы вясенняй шпацырнуцца
З гожай кабетай. Назад – аднаму.
Толькі б дадому здаровым вярнуцца...
Мужа сустрэнеш – капцы усяму.

*    *    *

Даўно не хапае сяброўскай рукі,
Жывое ўсё цемрай пакрыта.
Цёці ў рабоце, дзядзькі-вепрукі
Таўкуцца каля карыта.

## МЕТАМАРФОЗА

Жыў незалежна – волны сокал,
Сучасны, смелы, зух і хват.
Крытыкаваў усіх навокал,
Біў, як гавораць, у набат.

І выкрываў ілжэсвятыні –
Змагар за праўду і прарок.
Браў непрыступныя вяршыні
За крокам крок, за крокам крок!

Не пасадзілі, не забілі.
І ўсё ж аброць яму знайшлі:
Яго начальнічкам зрабілі
І крэсельца яму далі.

І хлопец нібы спатыкнуўся,
Крытычны пыл яго ачах.
Ачах, прыгорбіўся, сагнуўся,
Перамяніўся на вачах.

Ён ад душы цяпер вітае
Тых, з кім з агідай гаварыў.
«Ну, як здароўечка?» пытае
Таго, каго калісьці крыў.

Вось так і гінуць дэмакраты.
Ідзе нябачная вайна.
Цяпер не садзяць больш за краты.
Падсунуць крэсла – і хана!

*     *     *

Рохкаючы ля карыта,
Свіння наядала цела.
«Прашу запісаць: я – эліта,
Не кожнаму зразумелая».

Знайшліся такі эстэты,
Вылучылі з шэрай масы.
Пусцілі свінню на катлеты,
На студзень і на кілбасы.

*     *     *

Дарадцам я заўсёды рады,

Як бульбіне да селядца.
Я іх каштоўныя парады
Гатовы слухаць без канца.

Ім згодна галавой ківаю,
Іх слова кожнае лаўлю.
Ну, што – я розуму не маю?
Як кажуць, так я і зраблю.

Мне даланю дарадцы цісnуць,
Зычліва гладзяць па спіне.
Ад асалоды вушы віснуць
У разамлелага мяне.

Ад слабасці заллюся потам.
Ад шчасця аж разяўлю рот.
Перадыхну крыху – і потым
Усё зраблю наадварот.

*    *    *

Не бойцеся жартаў, панове,
Гартуе найлепш – анекдот.
Пры самай бязглуздай вымове
Засмейцеся ва ўвесь рот.

Нічога так зло не баіцца,
Як смеху – ён валіць з ног.
Не трэба змагацца і біцца.
Засмейся –
І ты перамог!

*    *    *

«Ты прымітыўна так пяеш»,
Казаў сталічны акулярык,
Унурыўшы крытычны тварык
У мой неавангардны верш.

«Сучасным будзь!
Любы мастак
Павінен быць крыху «со сдвигом».
Адчуў я звіх і тыцнуў фігу…

Глянь! Носам круціць –
Зноў не так.

*   *   *

Для жонкі ў хаце рай стварай,
Не задзірайся,
Райся.
Старых грахоў не паўтарай
І новых не цурайся.

*   *   *

Мой каханы – тонкі лірык –
Порткі прасядзеў да дзірак.
Што ні верш – няма цаны!
А за што купіць штаны?

*   *   *

Праходжу ля плоту Службы ўратавання.
Гляджу: ля варотаў – лепшы сябра Ваня.
За спатканне з Ванем пайшлі выпіваць.
І цяпер да рання нас не ўратаваць.

*   *   *

Я ведаў аднаго паэта,
Ён анічога не тварыў.
Народ любіў яго за гэта
І «дзякуй, братка» гаварыў.

*   *   *

Заўжды бясстрашным быў паэтам,
Гайдаўся на бурлівай хвалі.
Яго шпурляла к тым і гэтым,
Туды, дзе большы кус давалі.

*   *   *

«Ты пра што так задумліва марыш?» –
Сын адважыўся бацьку спытаць.
«Я хачу называцца «таварыш»,
Альбо панам сапраўдным стаць».

*   *   *

Сказаў аднойчы жаўранак саве:
«І хто з такой страшыдлаю жыве?»
Сава сказала, вылупіўшы вочы:
«Хто любіць пецьь, хто да мышэй ахвочы».

*   *   *

Знялі дурня аднаго
Перад домам генія.
Можа, дурасці ў яго
Ад таго паменее?

*   *   *

Майстра палкае прамовы,
Субяседнік адмысловы
Любіць скарбы роднай мовы,
А найболей: «Будзь здаровы!»

*   *   *

Залатое зімовае ранне.
Снег і сонца. Мігціць уваччу.
Думаў, буду спяваць пра каханне.
Не спяваецца. Есці хачу.

*   *   *

Яфрэйтар Васька Барсукоў
Хацеў забраць каханку ў Пскоў.
Уцяміў потым: у дурніцы
Манеры не для заграніцы.

*   *   *

Аднойчы позна Ян прыйшоў дахаты,
А з жонкай абдымаецца сусед.
Ян дрынам адлабузіў супастата:
«Не руш мой суверэнітэт!»

*   *   *

«З`еўшы селядца з цыбуляй,
Забаўляюся з Ганулял.
Моліць, просіцца Ганўся:

«Ой, не трэба... задыхнуся...»

*  *  *

Неяк святара Гаўрылу
Я на грэх угаварыла.
Келіх горкай выпіў поп,
Памаліўся – і захроп...

*  *  *

Каб узяла цябе халера,
Мужыка-функцыянера!
Быў, гаворыць, на нарадзе,
Сам па вушы
У памадзе.

*  *  *

Мой Валодзя быў на сходзе
Партыі, што ўжо не ў модзе.
Я кажу Валодзю:«Годзе!
Лепш шчыруй у агародзе!»

*  *  *

Заклікала мужа Ваню
Да мірнага суіснавання.
Зноў суседку мацае...
Будзе канфрантацыя!

*  *  *

Пасля выплаты зарплаты
Школьнік-сын бяжыць да таты.
Падбягае і крычыць:
«Бацька! Трэба замачыць!»

*  *  *

Ноч. Кашара. Цішыня.
Злодзей прыгарнуў ягня.
Дома – глядзь: а што ў мяху?
П`яны дзед у кажуху.

*   *   *

Запрасіла немца ў госці,
Той гяргеча доўга штосьці.
«Што гяргечыш, немчура?
Раскашэльвацца пара!»

*   *   *

Падвыпіўшы як след на пагулянцы,
Застолле заспявала на трасянцы.
А потым пачаліся танцы-шманцы.

*   *   *

На эпасы няма ў мяне здароўя,
Затое ані дня без двухрадкоўя!

*   *   *

Прыйшоў з прэзентам да каханкі Веркі.
Прагнала: вельмі танныя цукеркі.

*   *   *

«На што найбольш зважаць:
                    на змест альбо на форму?»
«А я б найперш цаніў
                    ідэйную платформу».

*   *   *

Пра камунізм ён разважаў за чаркай.
Дзед груба абарваў: «Не каркай!»

*   *   *

«Славянскі базар» зноў пачаўся ўчора.
Усё па-славянску: там выпіўкі – мора!

*   *   *

З каханкай п`ем віно.
                    «Еш, міленькая, піцу...»
«Я больш люблю

з гарышча палындвіцу...»

*   *   *

Да Лёшы бегала, губляючы галёшы,
Пакуль яшчэ у Лёшы былі грошы.

*   *   *

Пайшла я ў лес, каб назбіраць малін.
Там клешч залез, куды не трэба, блін...

*   *   *

Мы весяліліся з каханым да начы...
Як мне дамоў яго давалачы?

*   *   *

Сасніўся сон: іду па Краснай плошчы,
А побач крочаць Ленінавы мошчы.

*   *   *

Спявачка пела, колькі сілы мела.
Бабулька перад тэлекам самлела.

*   *   *

Пажарныя за прыз змагаліся, ўзмакрэлі...
За горадам, дзе хмыз, тарфянікі гарэлі.

*   *   *

Вясёлы смех душу аздараўляе.
А целу сілы сала дабаўляе.

*   *   *

Хоць блізка локаць, ды яго не ўкусіш.
А, можа, ўкусіш, калі вельмі мусіш.

*   *   *

Бывай, мой любы, Богу пакланіся,
І што не вернешся ніколі, пакляніся.

*   *   *

«Каханая мая, нябесны мой анёл!».
«Давай без рук ты, збродлівы казёл!».

*   *   *

Філосаф кніжку тоўстую чытаў
Ды хмурыў лоб, зубамі скрыгатаў.

*   *   *

Калі сасніш свінню альбо казла,
Прыпомні, з кім учора «чай» піла.

*   *   *

Калі ідзеш да мэты напрасткі,
Глядзі, не напарыся на сукі.

*   *   *

«Ты, мілы, можа й пекны… ды не дужа».
«І ты ж, каханая мая, не ружа».

*   *   *

Заўжды сярод пісьменнікаў на здымках –
Стыліст, спецыяліст па ананімках.

*   *   *

Чаму так моташна бывае аднаму?
Дык для забавы запрасі куму.

*   *   *

«Аднойчы, помніш,
мы ішлі да камунізму…».
«Ты нешта пераблытаў, гэта не са мной».

*   *   *

«Чаго іржэш, як жарабок стаенны?».
«А гэта, галубок, такія ў мяне гены…».

*   *   *

«Ну, што рабіць, няма ідэй ані».
«Дык адпачні ды чарачку кульні».

*    *    *

«Адкуль я з гэтаю цялушкаю знаёмы?».
«Вас бачылі ўдваіх каля стага саломы».

*    *    *

Зноў дзень прайшоў. Памалу вечарэе.
Мяне штось гэта ісціна не грэе.

*    *    *

Не асабіста да цябе ў мяне пагарда.
Я жудасны праціўнік авангарда.

*    *    *

Што, цяжка жыць, Ахрэме? – Анягож:
То спёка смажыць, то цурбоніць дождж.

*    *    *

Па вопыт быў пасланы за мяжу.
Набраўся. Пераварваю. Ляжу.

*    *    *

«Ніяк не зразумею, што ты хочаш...».
«Ды я і сам не ўцямлю, хоць забі...».

*    *    *

Я думаў: ведаюць усе усё,
А выявілася, што ніхто нічога.

*    *    *

Ахрэм  адчуў, што ўжо старэе,
Жыццё пражыўшы напавер.
Маркотна: ямба ад харэя
Ён не адрозніць і цяпер.

*    *    *

Ахрэм ішоў каля царквы,
Ён за душой граша не меў.

Спытаўся бацюшку: «А Вы?»
І той яго не зразумеў.

*   *   *

Ахрэм аднойчы быў галодны.
І вырашыў адведаць беляшоў.
Зайшоў у рэстаран
як чалавек свабодны.
З усімі павітаўся і дамоў пайшоў.

*   *   *

Ахрэм ля будпляцоўкі
выскачыў з трамвая
І моўчкі пастаяў, з увагай пасачыў,
Як «бабаю» магутнай забівалі сваі.
Ён назву «баба»
некарэктнай палічыў.

*   *   *

Ахрэм задумаўся аб *гэтым самым.*
Пакутваў страшна з першых крокаў.
Прыпеўкі пець пачаў
шляхетным дамам.
І дамы млелі ад яго намёкаў.

*   *   *

Ахрэм сустрэўся з кракадзілам,
Жывёлінай у нас даволі рэдкай.
Знайшоў яго даволі мільм
У параўнанні з маладой суседкай.

*   *   *

Ахрэма пацягнула да навукі,
Ён кніжку надта тоўстую купіў.
Чытаў, чытаў, млеў ад дакукі…
Павесіўся б, каб не запіў.

*   *   *

Ахрэм ішоў аднойчы да сяброўкі,
Каб запрасіць яе на гулі.

Ён сам любіў часнок
і ёй нёс дзве галоўкі.
Яна ж ужо наелася цыбулі.

* * *

Ахрэм хацеў за праўду пазмагацца,
У свеце рай адвечны ўсталяваць.
Ды часу не было
палітыкай займацца –
Любіў Ахрэм на дзевак паляваць.

* * *

Ахрэм паходзіць з нашай вёскі,
Ды на зямлі ніколі не рабіў,
Не браў у рукі ні пілы, ні коскі –
Ён грубай сілы не любіў.

* * *

Ахрэм сабе надыбаў дачу:
Там кветкі, дрэвы, сінія нябёсы.
Цяпер сядзіць ён пад кустом і плача.
Ён пернік еў – апанавалі восы.

* * *

Ахрэм імкнецца ў зааблочча,
Калі прасцей – дык выбіцца у людзі.
Сядзіць без працы. Славы хоча.
«Калі хацець як след, то будзе!»

* * *

Трамвай задзынкаў звонка,
як будзільнік.
Прачнуўся. Выскачыў.
Прыпынак быў не мой.

* * *

Калі б даляраў добры стос,
Тады б і я духоўна рос.

* * *

Ужо тады мы добра разумелі,
А сёння думаем: «А што гэта было?»

* * *

З'явілася вячэрняя раса –
І над лугамі зараўла папса.

* * *

Стаю задумлівы на крыжавой вярсце.
Ад раніцы вурчыць у жываце.

* * *

Пад цёплым сонейкам
засну́ў я каля рова.
Мне снілася будзённасць калярова.

* * *

«Мы на зямлі збудуем вечны рай!».
«Ну, тут, браток, хапіў ты цераз край».

* * *

Да раніцы карпею над радком,
На ложак пазіраючы крадком.

* * *

Узбіўся неяк на прыгорак...
Крычыць: «Глядзіце, я ж ля зорак!»

* * *

Мне хораша ад еднасці людской,
Я ўсім раўня... у лазні гарадской.

* * *

Хацелася б
пражыць сваё жыццё нанова...
Ці лепш не трэба... жыць было хрэнова...

* * *

«Не трэба гаварыць,
што ўсё на свеце чорна», –

Дзед ажывіўся, уключыўшы порна.

*   *   *

Бывае сорамна сябе самога.
Іду на людзі. І далей жыву.

*   *   *

Хоць ведаю: ні ў чым не вінаваты,
Ды страх па пятах бегае за мной.

*   *   *

Прыходзіць ноч, якую не люблю,
Ды нехаця іду ў яе абдоймы.

*   *   *

Шукаю… сам не ведаю чаго…
А, можа, нешта знойдзецца такое.

*   *   *

«Дзень добры!» – гучна сустракаў Цімох.
Сам думаў:
«Зноў прыпёрся, каб ты здох!»

*   *   *

«А ты ізноў, сябрук, мяне прадаў…»
«Я з радасцю б… але, хто возьме».

*   *   *

Устаў і доўга церабіўся,
Зноў вёртка на канапу ўзбіўся.

*   *   *

Быў год. Быў час. Была эпоха,
Ды кінула яна цябе, як «лоха».

*   *   *

«Вас адна дзяўчыначка шукала».
Азіраюся… Гэта не мне…

*   *   *

Філосаф летам часта спаў на сене.
«Трава сухая, – думаў,
– без насення».

*   *   *

Прачнуўся сярод ночы. Нешта сніў.
Не мог прыпомніць і назад вярнуўся.

*   *   *

Калі чакаеш канца свету,
Дык даядай хутчэй катлету.

*   *   *

«Мані, мані!» – ледзь адбіўся ад Мані я.
Што гэта ў дзеўкі за прыкрая манія?..

*   *   *

У кожнага вар'ята ёсць ідэя.
Ён верны ёй заўжды… А ты?

*   *   *

Я доўга думаў, што мне напісаць…
Заснуў…
Цікавае зноў снілася… Не ўспомніў…

*   *   *

«Ён сёння гэткі, што не вяжа лыка…»
«Тут дапаможа толькі «метад тыка».

*   *   *

У лаянцы ніколі першай не была.
Апошнім словам трапна дабівала.

*   *   *

Не будзь зласліўцам у чужой бядзе.
Павер мне – і табе перападзе.

*   *   *

Помніш, каля Юзевай мяжы…

Я табе быў малец не чужы…

*   *   *

Усё так хораша на белым свеце…
Каб толькі ты маўчаў, паэце.

*   *   *

Жанчыны неслі вёдры сырадою…
Ахрэм напяўся сілай маладою…

*   *   *

Калі сядзяць дзве побачкі жанчыны,
Ніводнай кампліментаў не кажы.

*   *   *

Пад шум і гам крычалі госці «Горка!»
Альтэрнатывы не было.

*   *   *

Калі раздаў замнога абяцанняў,
Забудзь іх лёгка. А было не верыць!

*   *   *

Мінула поўнач. Толькі што заснуў.
Прыбег сусед. «Ці ёсць што закурыць?»

*   *   *

Чарга мяне прашыла навылёт:
«Дзе быў?! Дзе быў?!»
                                        Замоўкні, тэрарыстка!

*   *   *

Нядзеля. Раніца. Хачу яешні з салам.
Ды не прачнуцца, сон смачней за ўсё!

*   *   *

Не спачувай падстрэленай лісе.
Лепш палічы курэй сваіх – ці ўсе?

*   *   *

Стаю, тваёй зачараваны ўсмешкай.
А хтосьці – цюк! – па галаве даўбешкай.

*   *   *

Калі распялі Ісуса Хрыста,
Расслабіўся Понцій: «А жыць – любата!»

*   *   *

Пытаюцца ў мяне: «А ты тут хто такі?»
Адказваю: «Во, во, я гэны самы…»

*   *   *

Дынамік раіў
                    месца саступаць цяжарным.
«Каторая тут з вас?» –
                         спытаўся гучна дзед.

*   *   *

Сяджу, прыдумваю лухту,
А потым спаць кладуся на тахту.

*   *   *

Паспрабаваў, як птушка, паляцець.
Вось як бяскрылы можа звар'яцець.

*   *   *

Калі правадыры
                    народ свой гучна хваляць,
Збірай манаткі… Павядуць у рай.

*   *   *

Ліслівенькімі часта пагарджаюць,
А ўсё ж чамусьці ад сябе не гоняць.

*   *   *

Мастак старанна маляваў пейзаж,

А крытык строга асудзіў: «Не наш!»

*   *   *

Вунь краму адчынілі на рагу…
Там косці называюцца «рагу».

*   *   *

Пры адыходзе ў іншы, лепшы свет
Забудзься  пра рубель,
                                    што пазычаў сусед.

*   *   *

«Містэр Том, –
                            у цішыні прамаўляла Тома. –
З Вамі радасці ані, адна толькі стома. Вы, часам, не гома?»

*   *   *

Наша Натка – лаўрэатка,
                                  напісала кніжку Натка.
Вельмі гожа, добра, гладка,
                              толькі сэнсу – каб зярнятка.

*   *   *

Ладзяць тусоўкі і п’юць, і гуляюць.
Дзяўчаты, падвыпіўшы,
                                        розум губляюць.

*   *   *

Закалаціўся аж, бы ўджаліла пчала,
Калі сказала «Ляж!» і макіяж зняла.

*   *   *

«Гайда на барыкады, ты ж такі герой».
«Ды я быў бы рады,
                                     калі б не гемарой».

*   *   *

Працуе Ўладзя на харчовым складзе.
Пры добрым раскладзе можа не сядзе.

*   *   *

На працы шэф мне дужа дапякаў.
Я дома мацюкаў яго, а ён ікаў.

* * *

«Баліць галава, аж няма паратунку».
«Не пі самагонку благога гатунку».

* * *

«Жыць хачу багата, гожа, як у казцы».
Муж трываць не можа:
«Якой табе трасцы?»

* * *

З душой, пабітаю іржой,
Шукае шчасця за мяжой.

* * *

«Карова рыкнула:
«Я малачко даю вам і на тым стаю».
«Ты толькі ціха стой, пакуль цябе даю».

* * *

На поўначы – зіма,
а на поўдні горача...
Няма справядлівасці, шчыра гаворачы.

* * *

«Самавук! Дзярэўня!» –
Знаёмы вельмі гук гарадскога пеўня.

* * *

«Перакладу цябе!» –
казаў мне майстра перакладу
І пераклаў стос вершаў
са стала ў шуфляду.

* * *

Аднойчы быў я – на забавы ласы –
на адным вяселлі.
Там маладыя закасэлі

і, як кілбасы, над сталом віселі.

*    *    *

Хто вінаваціць мяне ў плагіяце?
Ніводнай кніжкі няма ў маёй хаце.

*    *    *

Вось аб'ядналіся,
адкрылі разам «дзела».
Ён інтэлект уклаў,
яна ў дадатак – цела.

*    *    *

Відаць, настаўнік кніжак не чытае,
Заўжды пра тое-сёе ён дзяцей пытае.

*    *    *

Граніт навукі хлопец грыз да ачмурэння.
І засталося ад зубоў адно карэнне.

*    *    *

Калі рыхтуешся да развітання,
Дык не ўсчыняй каля дзвярэй таптання.

*    *    *

Да Дня жанчын нясу каханай кветкі.
Яна ж мне ў Дзень мужчын –
шкарпэткі.

*    *    *

Зверху жахліва скрыгоча
старое жалеззе.
Вясною на даху бляха на бляху лезе.

*    *    *

«Запахла воляй і вясной!»
«На поле зноў вывозяць гной».

*    *    *

«Пара абараняцца ўжо, пара!» –

Сказаў сабе і мэкнуў камара.

*     *     *

«Ах Сцёпа, мне абрыд твой сцёб!» –
Казаў так філантропу мізантроп.

*     *     *

Быў певень у гадах і не спяваў –
крактаў.
І гэтак крэкчучы, усё ж курэй таптаў.

*     *     *

І я чытаў, бывала, тое-сёе.
Ды мала разумеў... і перастаў – пустое.

*     *     *

Бяжым, бяжым, бабуля, за трамваем.
Ну, не дагонім,
дык хоць форму падтрымаем.
Спартовую!

*     *     *

Начальства трэба ўсёй душой любіць –
На гэтым можна добра зарабіць.

*     *     *

Сяброўцы кніжку ўдружыла Света:
«Чытай, вучыся, тут усё *пра ета».*

*     *     *

Доктар кажа ў размове з бамжом:
«А вы паспрабуйце папіць баржом».

*     *     *

Даўным-даўно у класе ля вакна
Сядзела твая першая *яна.*

*     *     *

Ніхто не навучыў мяне, як жыць.
Цяпер жыву, як сэрца мне падкажа.

*　*　*

Пакуль быў у сіле, дык наверх цягнуўся,
А цяпер – у мыле, і хрыбет сагнуўся.

*　*　*

«Хадзем у ягады, каханая, у лес».
«Баюся, што з табою атрымаю стрэс».

*　*　*

Ён ехаў конна і яго растрэсла,
І дні са тры яшчэ балела «крэсла».

*　*　*

Прачніся і спявай! І я спяваю.
За часам паспявай! Не паспяваю.

*　*　*

Калі наважыўся
　　　　　　як след завершыць справу,
Пакліч на каву прыгажуню Клаву.

*　*　*

Жыві! Не думай, што наканавана.
Хай будзе ўсё няклікана-нязвана.

*　*　*

А гэта хто прыйшлі? Адкуль?
　　　　　　　　　　Што за яны?
Адзін – куркуль. Астатнія – паны.

*　*　*

Пасля зарплаты жонка гоніць з хаты.
«Працуй, як след! Ці лезь у дэпутаты!»

*　*　*

Маланкай мільгае: напіцца, забыцца...
Страх перамагае: жонка будзе біцца.

*　*　*

Прылёг на ложак. Думаў адпачыць.
Так і не змог – у жываце вурчыць.

*   *   *

Ён хацеў да вялікасці геніяў вырасці,
Не хапала драбочка:
нязмушанай шчырасці.

*   *   *

Чэрпаем парады поўнаю жменяю,
А дурасці ў нас чамусьці не менее.

*   *   *

Мне ў фортку ноччу заляцела шчасце.
Я борздка ўскочыў і прамовіў:
«Здрасьце!»

*   *   *

Вася на вяселлі добра весяліўся.
Весяліўся, весяліўся і... пад стол
зваліўся.

*   *   *

Пацалаваў Міхась дзяўчыну тры разы.
Яна па твары плясь:
«Цяпер – на тармазы!»

*   *   *

Дзіравы самы сыр у сыравара Мішы:
«Купляйце, камандзір!
Мае эксперты – мышы!»

*   *   *

Ахрэм усталяваў гарэм.
Па густу жонак падбірае.
Але – бярэм ці не бярэм –
Рашае першая, старая.

*   *   *

Ахрэм пабіў свой леташні рэкорд,
І доўга рагатала ўсё сяло:
Умалаціў ён аж пудовы торт.
Не дачакаўся «хуткай». Пранясло.

*    *    *

Ахрэм служыць падаўся ў афіцэры,
Атрымліваў нярэдка ўзнагароды.
Аднойчы ён праспаў.
                    І не ў сваёй кватэры.
Паспеў да ўзнагароды праз гароды.

*    *    *

Ахрэм служыў міліцыянтам
У вёсцы недалёка ад шашы.
Ён быў заўсёды
                    адмысловым франтам:
Нёс службу ў шортах і капелюшы.

*    *    *

Ахрэм купіў сабе веласіпед,
У вёсцы людзі называлі: ровар.
Пакуль ім кіраваць не змог, як след,
Дык пешкі йшоў у лес па дровы.

*    *    *

Ахрэм аднойчы ехаў у трамваі,
Трамвай стары быў, жудасна трасло.
Убачыў:
          нейкі тып штось у кішэнь хавае...
Так і не ўведаў, што гэта было.

*    *    *

Ахрэм купіў сабе круты кампутар,
Па ім і мовы можна вывучаць.
Цяпер ён жонку называе «Мутэр».
Напрыклад:
               «Мутэр, можаш памаўчаць?!»

*    *    *

Ахрэм падняўся на гару,
Задумаўся на верхатуры:
«Энтузіязмам тут я не гару.
Бо нізкія тэмпературы».

*    *    *

Ахрэм заўсёды добра спіць.
За ноч, бывае, твар прыпухне.
І толькі, як прыспічыць піць,
Хістаецца, але ідзе на кухню.

*    *    *

Ахрэм чытаў надрукаваны гумар,
Смяяўся з аўтара: «Я не магу!
Бы капялюш надзеў –
                                        ды завялікі нумар,
Нібы галёш абуў на босую нагу!»

*    *    *

Ахрэм бываў – з сяброўкай –
                                                            у тэатры
І «брава!» сола на ўсю моц гукаў.
Ён шапку сваю новую – з андатры! –
Бярог і з рук не выпускаў.

*    *    *

Ахрэм паехаў за мяжу,
Хацеў духоўна крышку вырасці.
«Багацця ў іх, я вам скажу,
Як у маім падвале сырасці!»

*    *    *

Стаіць дзядок і – слінкі з барады...
А Ленін – малады,
                                        між іншым, – назаўжды.

*    *    *

Прамоўцу слухаў ён
                                        з усмешкай хітраватай,
Ківаў яму, заткнуўшы вушы ватай.

*    *    *

Адзін ляны, другі п’яны,
А жыць жадаюць, «як яны».

*    *    *

Я багацею з кожным днём. У сне.
О, бог Марфей, не здзеквайся з мяне!

*    *    *

«За нядзелю твае грудкі
добра парудзелі».
«Я ж на пляжы ледзь ня суткі
была ў самам дзелі».

*    *    *

Быць паслухмяным – хто супроць?
Толькі здыміце хамут і аброць.

*    *    *

Аднойчы ў сне знайшоў я партмане.
«А што купіць?» Не спалася ўжо мне.

*    *    *

Ішоў па лесе, раптам спатыкнуўся.
Я мацюкнуўся, лес мне адгукнуўся.

*    *    *

Нутро смыліць, душа гарыць...
Усё баліць... Ат, што там гаварыць!

*    *    *

Не адыходжу ні на крок ад Светы,
Бо Света смажыць смачныя катлеты.

*    *    *

Ён каля вёскі, дзе яго радзіма.
Хоць душаць слёзкі, праязджае міма.

*    *    *

«Цяпер ты мой!» –
сказала цвёрда Дуся.
І я спужаўся, ды шапнуў: «Здаюся!»

*    *    *

Хваліўся певень: «Я цяпер на ўзлёце.

Глядзіце, на якім сяджу высокім плоце».

*   *   *

Міліцыя прывезла п'янога к нам на двор.
Узяў крыху бядак замнога, іх сівы маёр.

*   *   *

Ніколі не быць мне народным героем.
З маім гемароем не пакрочыш строем.

*   *   *

Не толькі з мудрацамі сустракаюся.
І з дурнямі варункі маю. Каюся.

*   *   *

Сказаў студэнт: «Больш не магу вучыць:
Кацёл трашчыць, а ў жываце вурчыць».

*   *   *

«Скажы, Дзяніс, які ў цябе дэвіз?»
«Імкнуцца ўверх, а не каціцца ўніз!»

*   *   *

Жыццё, як той трамвай:
Заціснулі – трывай!

*   *   *

«Нікому не хачу служыць!»
«Тады скажы, як будзеш жыць?»

*   *   *

Каму – каменне, а каму – пячэнне,
Для вечнасці – ніякага значэння!

*   *   *

На майго старога малая надзея,
З'еў жэнь-шэню многа, а не маладзее.

*   *   *

Цішыня. Бяжыць сцяжына.
Лес з усіх бакоў.
Мне карціць завыць звярына,
спужаць грыбнікоў.

*   *   *

Ён тры разы пастукаў ёй у дзверы.
Адтуль быў голас: «Ну, якой халеры?»

*   *   *

Студэнт галодны філасофстваваў:
«Спачатку
Было яйцо, яго люблю я ўсмятку...»

*   *   *

Калі стваралі правілы маралі,
Нязгодных жорсткай смерцю пакаралі.

*   *   *

Стрыножылі каня, каб паскубаў на полі.
Жывёліна паўдня рада была волі.

*   *   *

У тым далёкім, у шасцідзесятым,
Быў я шасцідзесятнікам заўзятым.

*   *   *

Прыходзяць, канешне, у сны з даўніны
Клёцкі, яешня, мачанка, бліны.

*   *   *

У авангардысткі магутныя цыцкі,
І тырчаць так годна, нібы шпіль
гатыцкі.

*   *   *

Дзяцюк прамовіў ранкам на расстанне:
«Гэта не каханне, а – практыкаванне».

*   *   *

«Мы з табой не пасвілі свіней».
«Мы пасвілі гусей.
А ты свіней – пазней».

*   *   *

«Застрэлю!» – ружжо закрычала шалёна,
Само ж халастое было, без патрона.

*   *   *

Мастакі на прыгажунь палююць,
Малююць голых, а потым гандлююць.

*   *   *

Ой не спяшайся іншага судзіць,
Бо знойдзецца сіла й цябе пасадзіць.

*   *   *

«Падумаць жахліва, што з намі было».
«Думкі – гэта мліва. Думкі – гэта тло».

*   *   *

З выставы мадэрновай прыйшоў дамоў
Антось:
«Хрэнова-то хрэнова,
але ж і нешта ёсць».

*   *   *

«Не кожнаму дадзена
смерць зразумець»,
Тлумачыў змярцвеламу зайцу
мядзведзь.

*   *   *

Як файна анічога не рабіць,
Ёсць час смяяцца, плакаць, прыгубіць.

*   *   *

Не заклікайце мяне да парадку,
Дайце спакойна даесці аладку.

*    *    *

Калі добра ўкрыцца жончынаю футраю,
То нешта прысніцца рамантычна мудрае.

*    *    *

Марына цягне цёплую пярыну:
«Давай мы сёння зладзім вечарыну!»

*    *    *

Напіўся я ў Гэлі, а прачнуўся ў Нэлі,
І самому дзіва, як мы распанелі.

*    *    *

У нашым пасёлку ціха не бывае:
То тэлек спявае, то воўк завывае.

*    *    *

Няхай бы так было, як і было,
Каб толькі ад суседзяў не цякло.

*    *    *

У дамачкі вырвалі сумачку з рук:
А там – цыгарэты, а да іх – муштук.

*    *    *

Напэўна ж, не дзіва – халоднае піва,
Ды радзей удача – моцны чай гарачы.

*    *    *

«Не ў славе шчасце, а ў багацці»,
Гаварыла сваццця сваццці.

*    *    *

Слухалі паэта: сумна, нецікава...
Чакалі банкета, вабіла «халява».

*    *    *

Дзеўка маладая, жыве ані дбае,
Трапіла ў гарэм аднаго «бабая».

*   *   *

З яго ліліся афарызмы,
Як пасля клізмы.

*   *   *

Каля піўной ён рэзка спатыкнуўся,
І – Божа мой! – ля стойкі апынуўся.

*   *   *

Пасля таго, як з матушкаю павідаўся,
У бацюшкі ён больш не спавядаўся.

*   *   *

Не люблю я ні зброю, ні збрую,
Я з нязмушанай воляй сябрую.

*   *   *

Каханую былую ў бары сустракаю.
Бачу: пастарэла, ды не папракаю.

*   *   *

«Ты за каго – за нас альбо за іх?»
«Пасля перамогі прыйду да сваіх».

*   *   *

Пабыў я ў кампаніі, усе былі вясёлыя.
Хлопцы на падпітку,
дзяўчаты – амаль голыя.

*   *   *

Вучылі класікі смяяцца там, дзе
смешна.
А з цешчы выскаляцца, хлопцы, –
грэшна.

*   *   *

Пры гэткім інтэлекце,
гэткім буйным росце
Шмат што дазволена
і ў ранней маладосці.

*    *    *

У нашай хрушчоўцы – былыя вяскоўцы.
Кабеты сумуюць па ўласнай кароўцы...

*    *    *

Не бубні, стары, не гугні, стары.
Шклянка ўжо наліта – дык хутчэй бяры.

*    *    *

«Што за метафара такая:
«сабачае дзярмо?»
«Тое, што ўзнікае без цяжкасцяў, само».

*    *    *

Спыталі дзядулю: «Дзед, а ты
шчаслівы?»
Паказаў дзед дулю, прамовіў:
«Пайшлі вы...»

*    *    *

Узняў з падушкі галаву.
Жыву!

*    *    *

На нашым гародзе і хрэн не родзіць.
Толькі тхор завёўся і вельмі смуродзіць.

*    *    *

Прынесла закуску тысяч мо' на дзвесце,
І – па-беларуску:
«Ну, дык... смашна з'есьці...»

*    *    *

«Ты гэтак любіш сала і бліны?»
«А як бы я дажыў да сівізны?»

*    *    *

І ў нас былі вясёлыя забавы,
Хаця не ведалі ні тоніку, ні кавы.

*       *       *

Мяне ад смерці
ўратаваў бандыт Адась:
«Не біце», – загадаў, –
ён сам усё аддасць».

*       *       *

Я шмат раблю таго,
чаго рабіць не варта,
Ды так ужо лягла мая, як кажуць,
карта.

*       *       *

І гэта пройдзе, гаварыў мудрэц.
Быў той мудрэц па прадказаннях спец.

*       *       *

Яго ніхто не папракаў нахабствам,
Бо ён пакутаваў галавацяпствам.

*       *       *

Я кансерватар, палю папяросы
Як Леў Талстой, хаджу па дачы босы.

*       *       *

Схапіліся пабарацца, а хто дужэйшы.
За іхняй валтузнёю назіралі гейшы.

*       *       *

«А ці абяцаў ён, што з табой ажэніцца?»
«У рукі трапіў мне –
нікуды не дзенецца».

*       *       *

Я падарую табе фотку.
А ты налі мне, калі ласка, сотку.

*       *       *

Раздзяўбалі вершы,
мáўляў, шмат заганаў.
А ўсё-ткі я першы. Сярод графаманаў.

* * *
О, як разняволена пахабна спявае!
Народ задаволены. Галавой ківае.

* * *
Адкуль ты, хлапчына?
Мо' з дзікага хутара?
Як абыходзішся без кампутара?

* * *
Ад даўніх дзён, ад сівізны вякоў,
Народ не крыўдзіў п'яніц, жабракоў.

* * *
Сакрэтныя службы, выдайце сакрэты:
Як разбагацелі гэны альбо гэты?

* * *
Як маеце грошы,
дык вы іх хоць трацьце,
Каб народ убачыў, нашто вам багацце.

* * *
Нашы жыцці, нашы лёсы сплецены,
як косы
Мой любімы, мой каханы,
лысы, безвалосы!

* * *
З кожным сабакам можна паладзіць,
Калі падкарміць і па поўсці пагладзіць.

* * *
Пры Савецкай уладзе добра было ці не?
Табе, магчыма, добра,
а мне – дакладна! – не.

*   *   *

Заўзята спрачаюцца дэпутат з
міністрам.
«Падла!» – выражаюцца,
б’юць наўзмах каністрам.
(Апошняе слова ўзята для рыфмы. –
А.Н.)

*   *   *

Як паказаў эксперымент,
Сам ён – дзярмо, і выдаў экскрэмент.

*   *   *

Спявак з эстрады заклікае: «Падпявай!»
Крычу: «Я рады! Ганарар давай!»

*   *   *

Давай спаборнічаць,
як мы пісаць умеем:
Я – толькі ямбам буду, ты – трахеем.

*   *   *

Адзін п’яны вучоны НЛА сасніў,
На гэтым доктарскую і абараніў.

*   *   *

Пяшчотна прыспала. Коўдраю накрыла.
Каштоўнасці забрала. А я спаў, дурыла.

*   *   *

Чытаў ён вершы на вялікім сходзе.
Усе крычалі: «Адпачні, Валодзя!»

*   *   *

«Што значыць просты чалавек у свеце?»
Пасля трох чарак кіпяціўся Пеця.

*   *   *

Наш дух ратуе нас ад смерці,
Пакуль не прыдзе час памерці.

*    *    *

З’ездзіў за мяжу, у Рудню,
                                        без пратэкцыі,
І цяпер чытае – платна! – лекцыі.

*    *    *

Каханай гэткіх вершаў начытаў,
Што ўсе яе пачуцці затаптаў.

*    *    *

Уверсе, на сёмым паверсе –
У дзевы не грудзі, а персі.

*    *    *

Паэту сказала: «Ты пішаш дурноты...»
А ён адмаўляўся:
                              «Ну што ты? Ну што ты?»

*    *    *

Рэкс цешыўся: «Вось вырвуся на волю,
Тады сяброўцы песень наскуголю».

*    *    *

Сядзіць наш кот на печы, як паніч,
Пакуль не ўчуе сакавіцкі кліч.

*    *    *

Дзед сядзеў на ўслоне і люльку курыў.
«Я ў цябе ў палоне», бабці гаварыў.

*    *    *

Вось і разлучыліся, пайшлі хто куды.
Вельмі не журыліся: «А такой бяды!»

*    *    *

Да нас прыехаў містэр Скот.
                                    Прынялі гасцінна:
«Праходзьце, просім, напярод,
                                    таварыш Скаціна».

*    *    *

Быў нават час,
калі заможна ўсім жылося.
Але ўспамінаў ад яго не засталося.

*    *    *

Жыве па сваім,
незвычайным раскладзе.
Лётае высока. Але дзе ён сядзе?

*    *    *

Пагладзіў паненку па пекнай шчацэ.
Нарабіла енку: «Цо пан од мне хцэ?»

*    *    *

Бедны бомж начуе на лавачцы
ў Гданьску,
А ўсё роўна чуе ён сябе па-паньску.

*    *    *

Глянь: беларус, а гладкі, нават тлусты.
Есць дранікі з салам і...
без сэксраспусты.

*    *    *

Жыве стары адзін, нятлумна, у зацішку,
Жыццё сваё гартае, як чытае кніжку.

*    *    *

Здаецца мне: мы Богу замінаем,
Калі яго так часта ўспамінаем.

*    *    *

Праўда ў мове і ў слове.
А найперш – у душы, панове.

*    *    *

Думаю цяпер я, што рабіць:
Расказаць, што знаю, ці забыць?

*      *      *

«Давай! Давай!», – крычалі мне сябры.
А я ў адказ крычаў: «Бяры! Бяры!»

*      *      *

«Няўрымслівы, вясёлы, завадны,
І асабліва, калі мы адны».

*      *      *

Як хутка пралятае час!
Здавалася ж, што ёсць яшчэ запас.

*      *      *

Хто мяне навучыць,
Што рабіць, як пучыць?

*      *      *

Няма на свеце большай кары,
Чым бачыць у чужых руках даляры.

*      *      *

Хлапец сказаў:
                    «Дзень добры вам у хату!
Ці праўда, што павысілі зарплату?»

*      *      *

Ахрэм, лайдак, падаўся ў бізнес,
Тавараў розных накупіў.
Затым усё са склада вынес,
Забыўся, што сваё. Прапіў.

*      *      *

Ахрэм пісаў лісты ў нядзелю,
На тыдні вельмі быў заняты.
Таму яго пасланні мелі
Стыль урачыста-зухаваты.

*      *      *

Ахрэм на рынку гандляваў
Таматамі і агуркамі.

Нікому рэшты не даваў.
Ён называў усіх «браткамі».

*   *   *

Ахрэм – дзівак: рублёў наскроб,
Пазычыў сябру. Даў і еўра.
Ды выявілася: сябра – жлоб,
Была ў яго не аура, а хеўра.

*   *   *

Ахрэм пайшоў у сельсавет,
Каб напісалі там даведку.
«Мы вас спісалі на той свет.
А вы жывы? Прыводзьце сведку».

*   *   *

Ахрэм аднойчы шчупака
Падсек, як мае быць, на вуду.
Ды сэрца забалела ў рыбака.
«Шкада жывое. Больш не буду».

*   *   *

Ахрэм у шахматы гуляў,
Мо' сама лепш у цэлым свеце.
Сваёй гульнёй усіх здзіўляў:
Абдумваў ход у туалеце.

*   *   *

Ахрэм, пачуўшы навіну
(Ён радыё на кухні слухаў),
Прамовіў сам сабе: «Ды ну...»,
За вухам колькі часу чухаў.

*   *   *

Ахрэм – узорны сем'янін,
Не п'е, не курыць, не дурэе,
Уласнаручна склаў камін,
Зімой сядзіць, што трэба, грэе.

*　*　*

Ахрэм аднойчы загуляў,
Ён добра выпіў самагонкі.
Пайшоў у цір і там страляў,
Пакуль не выштурхнулі вонкі.

*　*　*

Ахрэм зрабіўся кандыдатам
Навук. І гэта святкаваў.
Ён крыў некандыдатаў матам –
Ацэнку «невукам» даваў.

*　*　*

Ахрэм стварыў вясёлы мадрыгал,
Дзе словы ўжыў:
«Адважны генерал...»
І генерал быў рады ад душы,
Прасіў Ахрэма: «Болей напішы!»

*　*　*

Ахрэм пайшоў з усімі ў скокі,
Сябе адчуўшы кавалерам.
Трымаўся смешна – рукі ў бокі,
Бо таньчыў ён старым манерам.

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год